ЗАЦВЯРЖДАЮ
Дырэктар установы адукацыі
“Магілёўскі дзяржаўны абласны ліцэй № 1”
____________П.У. Шылаў
____________2013 г.

Дата правядзення: 12 чэрвеня 2013г.
Час выканання работы: 45 хвілін

**Кантрольны дыктант па беларускай мове**
**для правядзення ўступнага экзамену ў 9 клас**

## Князь Вітаўт

Самым магутным сярод уладароў старажытнай Беларусі быў князь Вітаўт. Ён пражыў доўгае жыццё, поўнае прыгодаў і небяспекі.

Калі Вітаўт быў яшчэ малады, ворагі запрасілі яго разам з бацькам на мірныя перамовы. Паверыўшы, яны прыехалі без войска і без зброі. Схапіўшы Вітаўта і ягонага бацьку, ворагі закавалі іх у кайданы і пасадзілі ў турму. Потым князь Ягайла падаслаў у замак наёмных забойцаў, і тыя задушылі бацьку Вітаўта.

Трэба было ратавацца. Аднойчы ў турму да Вітаўта прыйшла жонка са служанкаю. Вартавыя прапусцілі дзвюх жанчын туды і дзвюх назад. Яны не ведалі, што ў адзенні служанкі з турмы выйшаў сам Вітаўт.

У доўгай барацьбе з Ягайлам Вітаўт перамог і, зрабіўшыся вялікім князем, узяўся ўмацоўваць сваю дзяржаву. А дзяржаўнай мовай у княстве была беларуская.

Паводле У. Арлова. (120 слоў)